Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 53 (122)
АЎТОРАК
5
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ЗА БОЛЬШЭВІЦКІ РАЗМАХ РАБОТЫ НА ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАХ

Усё бліжэй надыходзіць радасны дзень 24 сакавіка. Усяго толькі 20 дзён аддзяляюць нас ад гістарычнай даты, калі народы вызваленых абласцей будуць на аснове самай дэмакратычнай Сталінскай Канстытуцыі выбіраць у вярхоўныя органы ўлады сваіх верных сыноў і дачок, прадстаўнікоў непераможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Перамога,—вучыць нас таварыш Сталін, — сама не прыходзіць, яе звычайна прыцягваюць. Тым больш, калі справа ідзе аб такой кампаніі, як выбары, поспех якіх рашаюць мільёны выбаршчыкаў. Дайсці да кожнага выбаршчыка, расказаць яму яго вялікія правы і абавязкі, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, расказаць яму біяграфію і жыццёвы шлях кандыдата, які балатыруецца па данай акрузе, расказаць выбаршчыку аб тэхніцы галасавання, дабіцца, каб кожны выбаршчык быў занесен у спіскі, — вось важнейшыя пытанні, якія павінны быць вырашаны ў бліжэйшыя дні.

Многія ўчастковыя камісіі, даверaныя і агітатары зразумелі ўсю адказнасць дaручанай ім задачы і па-сапраўднаму разгарнулі ўсю многагранную прадвыбарчую работу. Вось, напрыклад, участак № 8 Чырвонаармейскай выбарчай акругі. Участак любоўна ўпрыгожан, створана ўтульная абстаноўка, якая прыцягвае сюды масы выбаршчыкаў. Выбаршчыкі прыходзяць сюды чытаць газеты, правяраць сябе ў спісках, звяртаюцца да членаў камісіі па розных пытаннях. Агітатары — частыя госці ў кватэрах выбаршчыкаў. На ўчастку працуюць 13 гурткоў.

Участак № 45 гэтай-жа акругі ўжо два разы праводзіў агульныя сходы сваіх выбаршчыкаў, паказана некалькі кінокарцін, мастацкая самадзейнасць. На ўчастку працуюць 45 гурткоў. Выбаршчыкам расказваюць аб Сталінскай Канстытуцыі, растлумачваюць выбарчы закон, знаёмяць з біяграфіямі кандыдатаў у дэпутаты.

Можна назваць яшчэ многа выбарчых участкаў, якія пасапраўднаму разгарнулі сваю работу. Але, на жаль, можна назваць не меншую колькасць участкаў і ў горадзе і тым больш па раёнах, дзе работа знаходзіцца ў пачатковым становішчы, дзе адсутнічае цесная сувязь участка са сваімі выбаршчыкамі, дзе неахайна складзены спіскі выбаршчыкаў, дзе маса выбаршчыкаў яшчэ не ведае біяграфіі сваіх кандыдатаў і г. д. Вось, напрыклад, участак № 66 Цэнтральнай выбарчай акругі, які размешчан на Совецкай вуліцы, № 46. Выбаршчыку нават цяжка знайсці свой участак. Тут не дагадаліся аб простай рэчы, каб вывесіць шыльду. У спісках выбаршчыкаў многа недакладнасцей. Толькі ў апошнія дні з'явіўся на ўчастак даверaны тав. Шумлінскі. Выбаршчыкам гэтага ўчастка не растлумачылі яшчэ, хто з кандыдатаў будзе тут балатыравацца. Ствараецца ўражанне, што выбарчая кампанія толькі пачалася.

Такое прыкладна становішча на 76 выбарчым участку Совецкай выбарчай акругі. На ўчастку створана ўсяго 5 гурткоў, якімі ахоплена каля 100 выбаршчыкаў, а з асноўнай масай выбаршчыкаў (іх больш 1500 чалавек) ніякая работа яшчэ не праводзіцца. На выбарчым участку выбаршчыкі— рэдкія госці. І гэта не дзіўна. Памяшканне ўчастка не абстаўлявана, не ўпрыгожана, нават стулляў не хапае, каб прысесці, пачытаць газету, кніжку, пагутарыць і г. д.

Усе гэтыя недахопы могуць быць і павінны быць неадкладна ліквідаваны. Старшыні акруговых і ўчастковых выбарчых камісій павінны па-большэвіцку ўзяцца за справу. Гаркомы і райкомы партыі, пярвічныя партарганізацыі не павінны задавольвацца тым, што яны вылучылі агітатараў, а штодзённа правяраць і дапамагаць ім у рабоце. Нельга задавольвацца лічбамі вылучаных людзей і створаных гурткоў, трэба ўдумацца ў сутнасць справы. Нядаўна сакратар Беластоцкага гаркома партыі тав. Сяргееў рабіў справаздачу на бюро абкома партыі аб падрыхтоўцы да выбараў. З вуснаў дакладчыка было чуваць аб тысячах вылучаных агітатараў, аб дзесятках тысяч людзей, ахопленых гурткамі. А на самай справе многія агітатары і гурткі лічацца толькі на паперы.

2-га сакавіка Беластоцкі сельскі райком партыі склікаў нараду старшынь участковых камісій. Здавалася-б, што на нарадзе будзе шырока разгорнута большэвіцкая самакрытыка, будуць выкрыты ўсе недахопы, будуць намечаны мерапрыемствы па іх ліквідацыі. Але варта было аднаму з прысутных тав. Раку ўказаць на сур'ёзныя недахопы ў рабоце раду ўчасткаў, як сакратар райкома тав. Анціпенка, а следам за ім і іншыя аратары, пачалі крытыкаваць Рака, а не сваю работу на ўчастках. Стварылася ўражанне, што крытыка Рака была адзінай мэтай нарады. Наўрад ці можна падобнымі адносінамі да самакрытыкі выправіць справу.

Дні, якія засталіся да выбараў, павінны быць напоўнены энергічнай, нястомнай работай усяго выбарчага актыва. Выбарчы ўчастак павінен стаць цэнтрам усёй прадвыбарчай работы. Партыйныя арганізацыі павінны глыбока ўнікнуць ва ўсе дэталі, ва ўсе дробязі, выпраўляючы на хаду ўсе недахопы. Толькі ўзяўшыся па-большэвіцку за справу, мы сустрэнем дзень выбараў арганізавана і забяспечым 100-процантную яўку выбаршчыкаў на свае ўчасткі, забяспечым бліскучую перамогу кандыдатам сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

——«о»——

ПАВЕДАМЛЕННЕ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ЗМЕШАНАЙ СССР І ГЕРМАНІІ ПАГРАНІЧНАЙ КАМІСІІ

27 лютага 1940 года закончана ўстанаўленне пагранічных знакаў на ўсёй адлегласці каля 1500 кілометраў совецка-германскай граніцы. Усяго ўстаноўлена 2820 пагранічных слупоў.

У асноўным закончана фатаграфічная здымка новай граніцы.



На здымку: Пётр Кірылавіч **Вайцэшук, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага** Совета БССР. (Фота-Сапір)

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Пятра Кірылавіча Вайцэшука з маладымі выбаршчыкамі

Трэцяга сакавіка ў клубе чыгуначнікаў адбылася сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Вайцэшука Пятра Кірылавіча з маладымі выбаршчыкамі. На сходзе выступіў тав. Вайцэшук.

— Таварышы! Праз 20 дзён у заходніх абласцях Беларусі адбудуцца выбары дэпутатаў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Вызваленыя Чырвонай Арміяй працоўныя заходняй Беларусі будуць ўпершыню выбіраць сваіх дэпутатаў ў вярхоўныя органы краіны. Гэта вялікае права нам дала Сталінская Канстытуцыя.

Вам, моладзі, не давялося ўдзельнічаць у выбарах па былой польскай канстытуцыі, па якой нам, пажылым людзям, прыходзілася галасаваць пад паліцэйскім націскам за буржуазных і памешчыцкіх дэпутатаў. Пад пагрозай арышту зганялі народ да выбарчых урнаў. Але як-бы яны ні стараліся, за іх кандыдатаў галасавала не больш паловы насельніцтва. Народу было ўсё роўна, хто будзе выбран — поп, генерал, ці крывапійца-памешчык. Усе яны аднолькава прыгняталі і эксплаатавалі працоўных.

Але ўсё гэта ўжо адыйшло ў мінулае. Гераічная Чырвоная Армія начыста змяла ўсю панска-памешчыцкую і афіцэрска-шляхецкую мразь з нашай зямлі. Над намі заззяла шчаслівае сонца Сталінскай Канстытуцыі, якая дала нам вялікія правы совецкіх грамадзян.

Таварышы выбаршчыкі! Вы мне аказалі вялікае давер'е. Дазвольце-ж за гэта давер'е народа выказаць першую падзяку таму, хто даў нам права выбіраць сваіх дэпутатаў народа, хто прынёс нам вызваленне з-пад панскага іга і прыняў нас у сям'ю совецкага народа, тварцу самай дэмакратычнай у свеце Канстытуцыі вялікаму Сталіну. Я выказваю вам, таварышы выбаршчыкі, гарачую падзяку за аказанне мне вялікае давер'е. Ваша давер'е я пастараюся выканаць ва што-б ні стала. Буду такім дзяржаўным дзеячом, які дастоін звання народнага выбранніка.

* * *

Пасля прамовы тав. Вайцэшука выступіў інструктар палітаддзела чыгункі тав. Сяргеенка. Ад усёй прысутнай моладзі ён запэўняў свайго кандыдата ў тым, што выбаршчыкі ў дзень выбараў усе, як адзін, аддадуць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за Пятра Кірылавіча Вайцэшука.

Л. Федасенка.

Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР Філіпа Сямёнавіча Пестрака з выбаршчыкамі

У гарадскім тэатры г. Гродна на сходзе працоўнай інтэлігенцыі выступіў кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР вядомы беларускі паэт Філіп Сямёнавіч Пестрак.

Гістарычны дзень 17 верасня,— сказаў у сваёй перамове тав. Пастрак, — назаўсёды застанецца для працоўных заходніх абласцей Беларусі ўсенародным святам. Пралілася не адна народная сляза радасці і падзякі слаўным байцам і камандзірам Чырвонай Арміі, якая вызваліла нас ад многавековага прыгнёту магнатаў, памешчыкаў і капіталістаў. Калісьці прыгнечаны народ, уздыхнуўшы ўпершыню поўнымі грудзьмі, на Народным Сабранні ўстанавіў совецкую ўладу. Зараз мы ідзем насустрач наступнаму гістарычнаму дню — дню выбараў у Вярхоўны Совет самага дэмакратычнага парламента ў свеце.

Толькі Сталінская Канстытуцыя гарантуе ўсенароднасць выбараў. Другіх падобных канстытуцый свет не ведае. У час выбараў у польскі сейм паліцэйскія ўчасткі былі поўны арыштаванымі. Гэта былі тыя, якія асмеліліся сказаць слова пратэсту супроць насілля буржуазіі пры выбарах. Буржуазная дэмакратыя давала свабоду толькі буржуазіі. Нечага і гаворыць аб сувязі сеймаўскіх паслоў з выбаршчыкамі, — ніякай сувязі не было і не магло быць.

Працоўная інтэлігенцыя, пры ўладзе капіталістаў не магла разгарнуць сваіх індывідуальных здольнасцей. Толькі пры совецкай уладзе адкрылася шырокая дарога для развіцця чалавечай асобы. Стаханаўскі рух з'яўляецца сведчаннем свядомых адносін працоўных да працы, паднімаючы рабочы клас да ўзроўню інтэлігенцыі. Стаханаўцы — рабочыя і інтэлігенты — гэта героі працы, у якіх асабістае не разыходзіцца з грамадскім, гэта практыкі рэволюцыйнага будаўніцтва. Такі совецкі чалавек.

Я шчаслівы, што зараз магу, нарэшце, пасля доўгіх год турмы, прысвяціць сябе цалкам народу і аддаць ўсе сілы за справу працоўных, што заўсёды было маім найвялікшым жаданнем.

Я пастараюся з чэсцю апраўдаць вялікае давер'е народа.

АД ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

Штаб Ленінградскай Ваеннай Акругі, пазнаёміўшыся з толькішто апублікаванай у замежным друку «нотай» так званага фінляндскага ўрада, накіраванай у Лігу Нацый і асуджаючай «метады вайны, прымяняемыя СССР», канстантуе, што ўся гэта «нота» састаіць з хлусівых фантастычных сцвярджэнняў, шытых белымі ніткамі.

1) Указаная «нота» сцвярджае, што «паветраныя совецкія рэйды супроць фінскага грамадзянскага насельніцтва праводзяцца амаль штодзённа», што «сотні самалётаў, часам звыш 500, удзельнічаюць у гэтых атаках», што «з совецкіх самалётаў было скінута каля 20 тысяч бомб», што «часта з самалётаў утваралася кулямётная стральба», прычым «нота» не спыняецца нават перад такой ні з чым несаабразнай хлуснёй, што быццам-бы ўсё гэта накіравана галоўным чынам супроць грамадзянскага насельніцтва. Аднак з самой-жа «ноты» відаць, наколькі нязграбны фінскія сачыніцелі. Так па нават яўна пераўвялічаных фінскіх даных, на якія ссылаецца «нота», у час паветраных бамбардыровак было забіта 392 чалавекі з ліку грамадзянскага насельніцтва. Такім чынам, за цэлыя тры месяцы ў выніку «амаль штодзённых» бамбардыровак, у якіх удзельнічалі сотні самалётаў, а часам і «звыш 500», лік забітых, нават па яўна раздутых фінскіх даных, дасягае, аказваецца, усяго 392 чалавекі.

Адзін гэты факт начыста абвяргае фантастычныя выдумкі, якія прыпісваюцца совецкім войскам і совецкай авіяцыі ў «ноце» абанкроціўшыхся фінскіх правіцеляў. Адзін гэты факт поўнасцю пацвярджае, што ў сапраўднасці совецкая авіяцыя ў сваіх многалікіх і паспяховых баявых дзеяннях абстрэльвала фінскія войскі, умацаванні, аэрадромы і іншыя ваенныя аб'екты на тэрыторыі Фінляндыі, а зусім не грамадзянскае насельніцтва, сярод якога, як відаць з фінскіх-жа даных, маюцца толькі невялікія афяры.

Такім чынам паклёпніцкі характар усёй гэтай «ноты» у адносінах да Чырвонай Арміі зусім відавочны, што толькі падкрэслівае бездапаможнасць і хлуслівасць яе сачыніцеляў.

2) Раз'юшаная фантазія сачыніцеляў «ноты» даходзіць да такіх бязглуздых сцвярджэнняў, як заявы, што «совецкія наземныя часці неаднаразова прымянялі палонных і грамадзянскіх асоб у якасці шчыта ў час сваіх атак супроць фінляндскай арміі», што «совецкія войскі быццам-бы прымянялі нейкі «каматозны газ, у выніку чаго 11 фінскіх артылерыстаў захварэлі», што быццам-бы «метады вайны на моры, прымяняўшыяся СССР, таксама супярэчаць міжнароднаму праву». Усе гэтыя галаслоўныя заявы, а таксама сцвярджэнні «ноты», што СССР быццам-бы парушыў гаагскую канвенцыю 1907 года і жэнеўскую канвенцыю ад 27 ліпеня 1929 года аб правілах вядзення вайны ні на чым не абаснаваны і з'яўляюцца поўнасцю фальшывымі вымысламі заблытаўшыхся ў сваіх злачынных справах фінскіх правіцеляў. Чырвоная Армія дастаткова моцна, каб не мець патрэбу ў прымяненні якіх-небудзь атрутных газаў, не гаворачы ўжо аб тым, што Чырвоная Армія лічыць прымяненне такіх газаў антымаральным і злачынным, падлягаючым безагаворачнаму і ўсеагульнаму асуджэнню.

Усе гэтыя паклёпніцкія вымыслы супроць Чырвонай Арміі не могуць аддаліць прыбліжаючагася канца авантуры фінскіх правіцеляў супроць Совецкага Саюза, як не могуць гэтаму дапамагчы і такія дзеянні фінскіх афіцэраў, калі перад вымушанай здачай совецкім войскам ваенных умацаванняў на Карэльскім перашэйку яны прывязваюць да сцяны і расстрэльваюць на месцы фінскіх салдат, не жадаючых ваяваць за безнадзейную справу.

3) Указаная «нота», спрабуючы упрыгожыць склаўшаеся для фінскай белагвардзейшчыны безнадзейнае становішча, заяўляе таксама, што «совецкім войскам удалося заняць толькі тэрыторыі, якія не маюць вялікага значэння».

Штаб Ленінградскай Ваеннай Акругі не лічыць патрэбным абвяргаць такія неразумныя заявы. Гэтыя сцвярджэнні стаяць на ўзроўні нядаўніх пераможных рэляцый фінляндскай белагвардзейшчыны, бязглуздасць якіх відавочна.

АПЕРЗВОДКА ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 3 сакавіка на Карэльскім перашэйку нашы часці, працягваючы абхватваць горад Выбарг, занялі мызу Саарэла — на поўнач ад Выбарга, захапіўшы чатыры 76-міліметровых гарматы і абсталяваны вузел штаба буйнага вайсковага злучэння і востраў Тупуран-Саары — на поўдзень ад Выбарга, дзе захапілі 6 умацаваных абаронча пунктаў праціўніка, з якіх 5 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванняў з спраўнымі берагавымі цяжкімі гарматамі.

На астатніх участках фронта нічога істотнага не адбылося.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіта 10 самалётаў праціўніка.



На здымку: Ваентэхнік 1 ранга І. І. Галавенка перадае агітлістоўкі старшаму палітруку, лётчыку - знішчальніку А. А. Івашкіну перад яго вылетам у бой. Тав. Івашкін узнагароджан ордэнам Чырвонага Сцяга. (Фота-клішэ ТАСС).

24 САКАВІКА ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР і БССР

ВЫБАРШЧЫКІ 581 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ НАЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА КАНДЫДАТА БЛОКА КОМУНІСТАЎ і БЕСПАРТЫЙНЫХ, ІВАНА АНТОНАВІЧА ТУРЛЕЙСКАГА!

ВЫБАРШЧЫКІ 366 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ПА ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ СОВЕТ БССР, УСЕ, ЯК АДЗІН, АДДАВАЙЦЕ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА НАРОДНАГА КАМІСАРА, ВЕРНАГА СЫНА БОЛЬШЭВІЦКАЙ ПАРТЫІ, ВУЛЬФА БОРУХАВІЧА ГАЙСІНА!

Іван Антонавіч Турлейскі

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)



Іван Антонавіч Турлейскі нарадзіўся ў 1913 годзе ў сям'і чыгуначнага кандуктара гор. Лодзі. Сям'я Турлейскага жыла на рабочай ускраіне, і ён з дзіцячых гадоў бачыў у сваёй сям'і і навокал галечу і нястачу.

У гімназіі, дзе вучыўся Турлейскі, як і ў іншых польскіх школах, моцна прывівалася нацыянальная варожасць.

Турлейскі вучыўся ўжо ў 7 класе, калі аднойчы ў гімназіі па ўказанню польскіх улад была арганізавана петыцыя аб абмежаванні праваў на вучобу для яўрэйскай моладзі, так званая «нумерус клаузус». Гэту петыцыю насілі па класах з тым, каб вучні-палякі падпісалі яе. Прынеслі на подпіс і Івану Турлейскаму. Ён уважліва прачытаў і наадрэз адмовіўся падпісваць петыцыю.

Школьныя шавіністы занепакоіліся. Склікалі нараду, абмеркавалі і... ў той-жа дзень Турлейскага моцна збілі.

У 1933 годзе тав. Турлейскі паступіў у варшаўскі палітэхнікум. Тут ён сустрэўся з прадстаўнікамі польскага комсамола, завязаў з імі сувязь і ў 1934 г. уступіў у рады комсамола. З гэтага года пачалося актыўнае палітычнае жыццё. Адданасцю і любоўю да даручанай справы ён скора заваяваў аўтарытэт у комсамольцаў і яго выбралі ў кіраўніцтва комсамольскай арганізацыі палітэхнікума, а затым членам варшаўскага камітэта комсамола.

Палітычнай работай ён захапляўся. У 1934 годзе Турлейскага за распаўсюджванне ў палітэхнікуме лістовак, заклікаўшых студэнтаў да барацьбы супроць жорсткага рэжыму, выкінулі з інтэрната. Ён пасяліўся на прыватнай кватэры ў рабочага. Наведваў рабочыя кварталы, праводзіў сходы, кіраваў гурткамі рабочых, выступаў на мітынгах.

К 1936 году дэфензіва ўжо добра ведала Турлейскага, як комсамольца, мела яго здымкі, але пры арыштах не магла здабыць ніводнага кампраметуючага дакумента.

У сакавіку 1936 года студэнты палітэхнікума рыхтавалі забастоўку супроць зверскага рэжыму, устаноўленага міністэрствам асветы. Дэфензіва, якой эндэкі данеслі аб забастоўцы, арыштавала Турлейскага. Пратрымаўшы тры дні і нічога не дабіўшыся, выпусцілі.

Забастоўка пачалася. У ёй прынялі ўдзел 3000 студэнтаў. Паліцыя акружыла палітэхнікум, каб адрэзаць студэнтаў ад горада. Студэнты збудавалі барыкады ў дзвярах і калідорах палітэхнікума, каб не дапусціць паліцыю ў памяшканне.

Абстаноўка стала вельмі напружанай. Аб забастоўцы студэнтаў даведаліся рабочыя, даведаліся журналісты. У замежным друку з'явіліся паведамленні аб забастоўцы студэнтаў і яе прычынах. Міністэрства асветы занепакоілася, шукаючы выйсця са становішча.

Выхад быў знойдзен. У палітэхнікум паслалі каля 500 эндэкаўскіх «малойчыкаў» — студэнтаў сельскагаспадарчага і іншых інстытутаў, у якіх вучыліся большасцю сынкі памешчыкаў і фабрыкантаў. Яны пранікалі ў палітэхнікум, акружылі арганізатараў забастоўкі і, зверскa збіўшы «гумамі», выкінулі на вуліцу. У ліку збітых быў і Іван Турлейскі.

Ледзь падняўшыся, яшчэ акрываўлены, пайшоў Турлейскі ў горад. За ім пайшлі многія пабітыя студэнты. Па дарозе да іх прымкнулі рабочыя і калі падышлі на плошчу Спасіцеля, сабралося больш двух тысяч народа.

На плошчы адкрылі мітынг, на якім Турлейскі выступіў з палкай прамовай аб правакацыі ў палітэхнікуме. Паліцыя разагнала дэманстрацыю, а Турлейскага арыштавала.

У канцы красавіка 1936 года Варшаўскі камітэт комсамола паслаў тав. Турлейскага на правядзенні першамайскай дэманстрацыі ў гор. Ломжу.

Прыехаўшы ў Ломжу, Іван Турлейскі звязаўся з арганізацыяй беспрацоўных, каб павесці іх на чале дэманстрантаў.

На вуліцы вышла больш 8000 працоўных. Яны неслі чырвоныя транспаранты з лозунгамі: «Няхай жыве народны фронт», «Няхай жыве адзінства працоўных». Дэманстрацыя пачалася каля Дома прафсаюзаў і накіравалася на плошчу «Стары Рынак». Пачаўся мітынг. Як ні стараўся пэпэсавец Кон і яго падручныя, каб дэманстрацыя пайшла пад лозунгамі ППС, гэта не ўдалося. Прамову Кона масы сустрэлі магільным маўчаннем.

Іван Турлейскі падышоў да трыбуны, якую замяняў стол, вынесены з магістрата, і правазгласіў:

— Няхай жыве комуністычная партыя!

У адказ на плошчы раздалася трохразовае магутнае «Няхай жыве!» Пэпэсаўскія кіраўнікі збянтэжыліся. Да трыбуны пачалі прабівацца паліцыянты.

Скарыстаўшы замяшанне, Турлейскі падняўся на трыбуну і пачаў палкую прамову.

Спробы паліцыі арыштаваць Турлейскага ў часе мітынга не ўдаліся. Беспрацоўныя стаялі шчыльнай сцяной вакол трыбуны і не дапусцілі паліцэйскіх. З мітынга дэманстранты арганізавана пайшлі назад к Дому прафсаюзаў.

У Доме прафсаюзаў Івана Антонавіча пераапранулі ў старую вопратку і астрыглі, але выйсці не было ніякай магчымасці. Паліцыя акружыла дом з усіх бакоў. Тады беспрацоўныя наладзілі бойку з паліцыянтамі. Скарыстаўшы мітуснёю, ломжынскі шавец Байкоўскі вывеў тав. Турлейскага праз сад у горад і давёў да вёскі Калінава-Пятніца, адкуль Турлейскі праз станцыю Чырвоны Бор паехаў у Варшаву.

Калі Іван Антонавіч звярнуўся ў палітэхнікум, оэнэраўцы разбілі яму галаву і збілі да страты прытомнасці. Толькі паспеў ён залячыць пабоі, як на кватэры з'явілася паліцыя. Турлейскага арыштавалі. 7 месяцаў трымалі ў дэфензіве. Суд прыгаварыў да двух гадоў турмы.

* * *

17 верасня Чырвоная Армія ўзняла над абяздоленай заходняй Беларуссю сцяг вызвалення. Пачалося новае жыццё.

Іван Антонавіч Турлейскі будучы ў гэты час у польскай арміі, кінуў зброю і пайшоў насустрэч Чырвонай Арміі. У кастрычніку ён прыбыў у Беласток, а затым накіраваўся ў Ломжу.

Працоўныя Ломжы выбралі тав. Турлейскага дэпутатам Народнага Сабрання Заходняй Беларусі. Як член Паўнамоцнай Камісіі Народнага Собрання, ён ездзіў у Маскву на сесію Вярхоўнага Совета СССР, бачыў вялікага Сталіна.

Працуючы на заводзе сельгасмашын тэхнарукам, тав. Турлейскі многа сіл аддаў аднаўленню разбуранага польска-германскай вайной завода.

Працоўныя Ломжы з радасцю падтрымалі прапанову тэкстыльшчыкаў Беластока аб вылучэнні тав. Турлейскага кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР. Яны ўпэўнены, што тав. Турлейскі апраўдае давер'е народа.

Выбаршчыкі 581 выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР, галасуйце за вернага сына народа, за кандыдата непапаможнага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, Івана Антонавіча Турлейскага!

І. Каральноў.

Вульф Борухавіч Гайсін

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)



Жыццёвы шлях Вульфа Борухавіча Гайсіна—ад радавога рабочага да народнага камісара—гэта шлях людзей, выраслых з гушчы народных мас, выгадаваных і выхаваных совецкай уладай, партыяй большэвікоў.

Нарадзіўся Вульф Борухавіч у 1906 годзе ў горадзе Гомелі. Бацька яго быў возчыкам-балаголам, а затым грузчыкам на чыгунцы. На мізэрныя сродкі бацьку прыходзілася ўтрымліваць вялікую сям'ю, і Вульф 14 год павінен быў пакінуць школу і пайсці працаваць кур'ерам. У тыя годы былі арганізаваны прафесіянальна-тэхнічныя школы, у якіх можна было атрымаць пэўную прафесію. У адну з такіх школ і паступіў Вульф у 1921 годзе. Атрымаўшы кваліфікацыю шаўца, ён стаў працаваць на гомельскай абутковай фабрыцы.

У 1926 г. партыйная арганізацыя паслала тав. Гайсіна ў Гомельскую губернскую партыйную школу. Тут ён папоўніў свае веды і па сканчэнні школы быў прызван у рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

У 1930 г. Вульф Борухавіч звярнуўся на родную фабрыку, але ўжо ў якасці дырэктара. Фабрыка гэта была створана з дробных саматужных майстэрань са старым разбітым абсталяваннем. І тав. Гайсін сумесна з калектывам рабочых бярэцца за яе рэканструкцыю, за арганізацыю вытворчасці. Скора фабрыка вырасла ў буйнае, добра абсталяванае прадпрыемства.

У 1934 г. тав. Гайсін назначаецца дырэктарам аднаго з буйнейшых прадпрыемстваў папяровай прамысловасці Совецкага Саюза — Добрушскай фабрыкі «Герой працы». За 4 годы ён прарабіў велізарную работу па паляпшэнню работы фабрыкі, мабілізуючы рабочых на барацьбу за павышэнне колькасці і якасці прадукцыі. За той час вытворчая магутнасць фабрыкі ўзрасла ў тры з паловай разы. Рабочыя любілі свайго дырэктара за яго адданасць справе рабочага класа, за яго непрымірымасць і нянавісць да ворагаў працоўных, якія імкнуліся развальваць вытворчасць.

У 1938 годзе збіралася першая сесія Вярхоўнага Совета БССР. Пасланцы народа—дэпутаты Вярхоўнага Совета—сфарміравалі Совет Народных Камісараў. Як вернага сына беларускага народа, адданага вялікай справе любімай партыі Леніна — Сталіна і інтарэсам працоўных, сесія назначыла тав. Гайсіна народным камісарам лясной прамысловасці рэспублікі.

Надышлі гістарычныя верасенскія дні 1939 года. 17 верасня непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія па загаду галоўнага камандавання панесла сцяг свабоды народам Заходняй Беларусі. Тав. Гайсін на чале групы работнікаў быў паслан партыяй для работы ў горад тэкстыльшчыкаў — Беласток.

Прыбыўшы ў Беласток 22 верасня, Вульф Борухавіч адразу быў назначан старшынёю часовага ўпраўлення горада.

Пачаліся гарачыя дні.

Горад быў напалову мёртвы. Спыненыя, у большасці яшчэ перад пачаткам польска-германскай вайны, нерухома стаялі варштаты фабрык. На варотах віселі замкі. Тэлефонная станцыя не працавала. На чыгуначнай станцыі ў тупіках стаялі застылыя паравозы, — чыгунка замёрла. І толькі вуліцы былі заўсёды, удзень і ўночы, перапоўнены народам, які сустракаў сваю вызваліцельніцу—Чырвоную Армію.

Трэба было ажывіць горад: пусціць фабрыкі, наладзіць тэлефонную сувязь, ажывіць чыгунку, прымусіць гандляроў адчыніць магазіны.

У гарачай рабоце асеннія ночы праходзілі непрыкметна. У кабінет Вульфа Борухавіча зранку, удзень і позна ўночы прыходзілі наведвальнікі, збіраліся пасяджэнні, нарады. Гэты кабінет стаў жыццёвым цэнтрам горада, яго асноўным нервам.

Вульф Борухавіч гутарыў з рабочымі, выклікаў да сябе фабрыкантаў, гандляроў, загадваў ім пускаць прадпрыемствы, адчыняць магазіны.

Горад ажываў. Аднавілася дзейнасць тэлефоннай станцыі, задымілі фабрычныя каміны, пайшлі ў рух паязды, пачаліся заняткі ў школах.

Часовае ўпраўленне адмяніла плату за вучобу ў школах для дзяцей працоўных. Пастанову аб гэтым насельніцтва сустрэла з нечуванай радасцю. Следам за гэтым было ўведзена бясплатнае медыцынскае абслугоўванне працоўных. Пачалі адкрывацца новыя класы, новыя школы. Адкрываліся новыя бальніцы, медпункты, павялічвалася колькасць медработнікаў. Патрабаваліся новыя настаўнікі.

Масы працоўных перакаваліся на жыццёвых фактах, што аб іх штодзённа клапоціцца большэвіцкая партыя і совецкі ўрад.

Жыццё ў горадзе наладжвалася. Вульфа Борухавіча назначылі старшынёй часовага ўпраўлення Беластоцкай вобласці.

Падыходзілі новыя задачы. На вырашэнне станавіліся вузлавыя пытанні: пытанні аб уладзе, аб зямлі, аб фабрыках і заводах.

Часовае ўпраўленне Беластоцкай вобласці звярнулася да ўсіх часовых упраўленняў Заходняй Беларусі з прапановай аб скліканні Народнага Сабрання. Быў створан камітэт па скліканню Народнага Сабрання, на чале якога стаў Вульф Борухавіч Гайсін.

Паведамленне аб скліканні Народнага Сабрання працоўныя сустрэлі з нябачаным палітычным уздымам. Сходы рабочых і сялян, сходы працоўнай інтэлігенцыі вылучылі лепшых прадстаўнікоў народа сваімі кандыдатамі, і 22 кастрычніка аднадушна выбралі дэпутатаў Народнага Сабрання.

Сярод выбраных быў і Вульф Борухавіч, вылучаны тэкстыльшчыкамі Беластока.

Народнае Сабранне выканала волю народа. Асноўныя пытанні, жыццёвыя пытанні вызвалення народа былі вырашаны.

ЦК КП(б)Б адклікаў Вульфа Борухавіча Гайсіна на ранейшую работу Народным Камісарам лясной прамысловасці БССР, дзе ён працуе і зараз. Працоўныя масы Беластоцкай вобласці добра ведаюць тав. Гайсіна. Выбаршчыкі 366 акругі вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і аддадуць свае галасы за вернага сына народа.

Д. Пінхасік

В. Іванеў.

У ДАПАМОГУ АГІТАТАРУ

МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ 8-ГА САКАВІКА

8 сакавіка — Міжнародны камуністычны жаночы дзень — увайшло ў гісторыю рэвалюцыйнай барацьбы як знамянальная дата.

У гэты дзень Камуністычны Інтэрнацыянал пад сцягам Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна праводзіць агляд гатоўнасці працоўных жанчын усяго свету да рэвалюцыйнай барацьбы за вызваленне прыгнечанага чалавецтва, да барацьбы супроць імперыялізма і вайны, за сацыялістычную рэвалюцыю.

У нашай краіне гэты дзень з'яўляецца святам вызвалення жанчыны.

Кожны год 8 сакавіка савецкія жанчыны падводзяць вынікі заваяваных перамог і яшчэ больш мабілізуюць свае сілы на выкананне задач, пастаўленых нашай партыяй і ўрадам па будаўніцтву камунізма, па ўмацаванню абароны краіны.

Пройдзены год — асаблівы, выдатны год. У мінулым годзе адбываўся XVIII з'езд Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў, на якім наш правадыр і настаўнік таварыш Сталін з велізарнейшай глыбінёй і геніяльнасцю раскрыў супярэчнасці, існуючыя ў капіталістычных краінах, паказаў веліч перамог нашага сацыялістычнага ладу, даў новую баявую праграму далейшай барацьбы за камунізм.

Мудрая сталінская палітыка нашай партыі і савецкага ўрада забяспечыла вызваленне брацкіх народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ад прыгнёту панскай Польшчы і з'яднанне іх з народамі УССР і БССР.

Жанчыны вызваленых цяпер народаў праяўляюць вялікую палітычную актыўнасць у падрыхтоўцы да выбараў дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР і Вярхоўных Саветаў Украінскай і Беларускай рэспублік. Яны ўдзельнічаюць у выбарчых камісіях, агітуюць за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных.

У краіне сацыялізма жанчына з'яўляецца поўнапраўным членам грамадства, змагаром і будаўніком камунізма, актыўным удзельнікам палітычнага, грамадскага жыцця.

Ленін і Сталін, вырашаючы вялікія задачы сацыялістычнай рэвалюцыі і будаўніцтва камунізма ў нашай краіне, заўсёды ўказвалі на велізарную ролю, якую павінна адыграць жанчына-работніца і сялянка ў барацьбе за камуністычнае грамадства.

Самы выдатны вынік нашай барацьбы — Сталінская Канстытуцыя, у якой заканадаўча замацаваны велізарнейшыя перамогі сацыялізма, атрыманыя працоўнымі СССР.

Адной з гэтых перамог з'яўляецца поўнае раўнапраўе жанчыны, прадастаўленне ёй роўных правоў з мужчынай. У нас у Савецкім Саюзе ажыццёўлена сапраўдная сацыялістычная дэмакратыя, і жанчына побач з усімі працоўнымі ўдзельнічае ў грамадскіх справах і ў кіраванні дзяржавай.

На працягу многіх дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў прадстаўнікі розных вызваленчых рухаў і рэвалюцый выстаўлялі патрабаванні аб роўнапраўі жанчын. Але бяспраўе жанчыны не знішчана на пяці шостых зямнога шара — усюды, дзе пануе капіталізм і буржуазія.

Працоўныя жанчыны ў капіталістычных краінах — аб'ект самай жорсткай эксплаатацыі і грубейшага насілля. У Англіі, напрыклад, заработная плата работніц складае толькі каля 60 проц. заработку мужчыны за роўную з ім працу. Ва Францыі зарплата тэкстыльшчыцы за годы крызіса знізілася на 40 проц. Яшчэ зусім нядаўна ў панскай Польшчы тэкстыльшчыцы атрымлівалі 30—40 проц. заработнай платы мужчын-рабочых.

Вайна ў Еўропе, завязаная імперыялістычнымі драпежнікамі Англіі і Францыі, пагоршыла і без таго цяжкае становішча жаночых працоўных мас. Мільёны сямей рабочых і сялян, мабілізаваных на фронт, пазбавіліся сваіх кармільцаў і асуджаны на голад. Гвалтоўная эвакуацыя сотэнь тысяч жанчын і дзяцей, рост дарагоўлі, шалёнае павышэнне падаткаў, недахоп прадуктаў харчавання, узмацненне капіталістычнай эксплаатацыі — усё гэта галоўным сваім цяжарам лягло на плечы жанчын.

У Англіі капіталісты разам з жоўтымі прафсаюзамі прадпрымаюць новае наступленне на жыццёвы ўзровень і правы працоўных. Рыхтуючыся да Міжнароднага камуністычнага жаночага дня, англійская кампартыя заклікае правесці ў гэты дзень масавыя дэманстрацыі пад лозунгамі павышэння заработнай платы, павелічэння дапамогі сем'ям прызваных у армію і т. д.

Цяжкае і беспраcветнае жыццё працоўнай жанчыны ў капіталістычных краінах. Буржуазія пазбавіла яе нават тых нікчэмных «правоў», якія прадастаўляюцца працоўнаму мужчыне.

Таварыш Сталін на Усесаюзным Надзвычайным VIII з'ездзе Саветаў, гаворачы аб буржуазных канстытуцыях, сказаў: «Яны гавораць аб роўных правах грамадзян, але тут-жа агаварваюцца, што гэта не датычыцца жанчын, або датычыцца іх часткова».

Ні адна з капіталістычных краін ніколі не вырашыць задачы роўнапраўя і раскрапашчэння жанчын. Гэту задачу магла вырашыць і вырашыла толькі Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, вырашыла вялікая партыя Леніна—Сталіна.

Сотні тысяч жанчын з народа вылучыла бальшавіцкая партыя і савецкая ўлада на кіруючую дзяржаўную, партыйную, гаспадарчую і прафсаюзную работу. У нашым сацыялістычным парламенце — Вярхоўным Савеце СССР — 189 дэпутатаў-жанчын. У Вярхоўных Саветах саюзных і аўтаномных сацыялістычных рэспублік 1436 дэпутатаў-жанчын, а ў мясцовыя саветы дэпутатаў працоўных выбрана 422.279 жанчын. Гэтыя жанчыны прынеслі з сабой непахісную вернасць, бязмежную адданасць справе партыі Леніна—Сталіна. Яны прышлі да *работы з высока ўзнятым* бальшавіцкім сцягам беззаветнага служэння сацыялістычнай радзіме і народу.

Мясцовыя саветы — самыя блізкія населніцтву органы савецкай улады. Ад іх работы залежыць не толькі далейшае развіццё прамысловасці і сельскай *гаспадаркі, але і становішча* магазінаў, сталовых, лазняў, пральняў, бальніц, дзіцячых устаноў, школ, клубаў, упарадкаванне жыллёвых дамоў, чыстата вуліц. Ад дзейнасці мясцовых саветаў залежыць паспяховае выкананне плана трэцяй сталінскай пяцігодкі і ўсіх заданняў нашай партыі і ўрада.

Актыўна працуючы ў мясцовых саветах, жанчыны выконваюць велізарную дзяржаўную справу.

Найшырэйшыя жаночыя масы ўдзельнічаюць у грамадскіх арганізацыях краіны. Больш 9 мільёнаў жанчын з'яўляюцца членамі прафсаюзаў, звыш 400 тысяч выбрана членамі пленумаў цэнтральных, краявых, абласных камітэтаў і фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў. Жанчыны змагаюцца за лепшую арганізацыю працы на вытворчасці, за моцную працоўную дысцыпліну, за перавыкананне норм выпрацоўкі, высокую прадукцыйнасць працы, добрую арганізацыю культурна-бытавога абслугоўвання.

За гады сталінскіх пяцігодак моцна вырасла колькасць жанчын-работніц і служачых. Калі ў 1932 годзе ва ўсёй народнай гаспадарцы працавала 6007 тысяч жанчын, або 27,4 проц. агульнай колькасці рабочых і служачых, то ў 1939 годзе іх ужо налічвалася 10.773 тысячы, або 37,4 проц. У СССР жанчына можа працаваць і працуе літаральна ва ўсіх галінах прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Сваёй прадукцыйнай работай яна ніколькі не ўступае мужчыне і атрымлівае роўную з ім зарплату за сваю працу.



«Жанчыне ў СССР прадастаўляюцца роўныя правы з мужчынай ва ўсіх галінах гаспадарчага, дзяржаўнага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця». (Канстытуцыя СССР, арт. 122).

Савецкі лад узняў і выхаваў сотні тысяч жанчын, якія паказваюць выдатныя ўзоры сацыялістычнай працы, беззаветнай адданасці сваёй сацыялістычнай радзіме і вялікай справе камунізма. З кожным годам расце колькасць перадавых жанчын, якія сваёй гераічнай працай, сваёй адвагай заваявалі любоў і сімпатыі народных мас і адзначаны нашым урадам высокімі ўзнагародамі.

Праца ў нас — справа чэсці, справа славы, справа доблесці і геройства. Дзе-б ні працавала савецкая жанчына, яна імкнецца *да таго, каб павысіць сваю кваліфікацыю, авалодаць тэхнікай вытворчасці.* Перад савецкай жанчынай адкрыта шырокая дарога. У нас ёсць жанчыны — Героі Савецкага Саюза. Звыш 100 тысяч жанчын-інжынераў і тэхнікаў працуе ў нашай прамысловасці; 12 з палавінай тысяч— навуковымі работнікамі. У іх ліку *ёсць сапраўдныя члены і члены-карэспандэнты* Акадэміі навук СССР. З агульнай колькасці вылучаных за кароткі час на кіруючую дзяржаўную і партыйную работу больш 20 проц. складаюць жанчыны.

1940 год — трэці год трэцяй сталінскай пяцігодкі — нясе нам новыя, сусветна-гістарычныя перамогі сацыялізма. СССР уступіў у паласу завяршэння будаўніцтва бяскласавага сацыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад сацыялізма да камунізма.

Гэты год з'явіцца годам далейшага разгортвання барацьбы за павышэнне прадукцыйнасці працы, за яшчэ большае ўмацаванне абароннай магутнасці нашай радзімы, за новы ўздым сацыялістычнай культуры і матэрыяльнага дабрабыту савецкага народа. Пачотнае месца ў гэтай вялікай барацьбе адведзена савецкай жанчыне.

Задачы, пастаўленыя планам трэцяй сталінскай пяцігодкі, выклікалі новы ўздым сацыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху. У многіх галінах народнагаспадарчага жыцця жанчына з'яўляецца пачынальнікам сацыялістычнага спаборніцтва і вядзе за сабой, як перадавы баец, тысячы людзей.

Самае важнае ў гэтым новым уздыме сацыялістычнага спаборніцтва — пераход на многастаночную работу і сумяшчэнне прафесій.

У руху за высокую прадукцыйнасць працы, за датэрміновае выкананне заданняў трэцяй пяцігодкі жанчыны паказваюць выключныя ўзоры.

Ткачыха Екацярына Іванаўна Падсабляева, працуючы на фабрыцы імені Ногіна, абслугоўвае 284 станкі. За першае поўгоддзе 1939 года яна выканала план на 105,45 працэнта, выпрацаваўшы звыш плана 53.421 метр мануфактуры. Тав. Падсабляева ўзнагароджана ордэнам Леніна.

Тав. Аўчыннікава, якая працуе ў ролікавым цэху 1-га дзяржаўнага шарыкападшыпнікавага завода імені Л. М. Кагановіча, абслугоўвае 7 станкоў замест трох, план выконвае на 150 проц.

Асаблівай увагі заслугоўвае рух жанчын на чыгуначным транспарце. Па ініцыятыве Зінаіды Троіцкай яшчэ ў 1938 годзе была арганізавана першая *жаночая паравозная брыгада* ў дэпо Масква — Сартыровачная, Ленінскай чыгункі.

Прыклад Троіцкай выклікаў *шырокі водгук.*

У другой палавіне 1939 г. на чыгунках Савецкага Саюза ўжо 48 жанчын працавалі паравознымі машыністамі і 4500 — памочнікамі машыніста. Больш 23 тысяч жанчын закончыла навучанне на курсах па розных чыгуначных спецыяльнасцях.

Жонка машыніста дэпо Сартыровачная, маці чатырох дзяцей Антаніна Георгіеўна Чупакова, была хатняй гаспадыняй. Яна энергічна прынялася за вучобу. Скончыўшы шасцімесячныя курсы, тав. Чупакова стала працаваць памочнікам паравознага машыніста. За ўзорную работу на транспарце ўрад узнагародзіў тав. Чупакову ордэнам «Знак Почета».

Па ініцыятыве перадавых савецкіх жанчын узнікла масавае імкненне патрыётак дапамагчы мужам і братам у іх рабоце на вытворчасці, замяніць, калі гэта будзе трэба, ля станкоў і агрэгатаў рабочых-мужчын.

Тт. Людміла Падсявалава і Тацьяна Іпалітава на Магнітагорскім заводзе ім. Сталіна прайшлі курс навучання і ў цяперашні час працуюць: першая памочнікам машыніста, другая—падручным сталявара. Прыкладу тав. Падсявалавай паследвалі 16 дзяўчат, якія ўжо працуюць памочнікамі машыністаў.

На металургічны завод ім. Дзяржынскага прышлі працаваць 400 жонак рабочых, на Варшавылаўградскі паравозабудаўнічы завод — 1500 жанчын — хатніх гаспадынь.

З няменшай сілай разгарнуўся рух хатніх гаспадынь на шахтах, дзе жанчыны пачынаюць авалодваць найбольш складанымі прафесіямі.

Калгасны лад завяршыў пачатае ў Кастрычніку 1917 года раскрапашчэнне жанчыны-сялянкі. Пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна калгасы вывелі жанчыну на шырокую дарогу палітычнага, культурнага і заможнага жыцця. Калгасны лад даў поўную магчымасць жанчынесялянцы разгарнуць свае здольнасці і таленты. Яна — ударніца і стаханаўка, актыўны дзяржаўны дзеяч. Сотні тысяч жанчын працуюць у сельскіх, раённых і абласных саветах; сотні тысяч — у якасці старшынь і членаў праўленняў калгасаў, звеннявых і брыгадзіраў; 32.000 жанчын працуюць трактарысткамі, больш 8000 — камбайнерамі і 16.000 — памочнікамі камбайнераў. Калгасніцы добра памятаюць словы таварыша Сталіна аб тым, што «... толькі ў калгасе маюць яны магчымасць стаць на роўную нагу з мужчынай. Без калгасаў —няроўнасць, у калгасах — роўнасць правоў».

За Дземчэнка, Гнаценка, Кавардак, Ангелінай, якімі ганарыцца ўвесь савецкі народ, падняліся новыя тысячы і тысячы жанчын — перадавікоў сацыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі.

Калгасны лад прабудзіў мільёны жанчын да новага, радаснага жыцця. Калгасніцы-бавоўнаводы Узбекістана, Казахстана, Кара-Калпакіі, Таджыкістана, Туркменістана, Азербайджана зламалі старыя нормы і дабіліся такіх ураджаяў, якіх не ведае ні адна капіталістычная краіна.

Забітыя пры царызме жанчыны нацыянальных ускраін знімаюць чадру і паранджу і смела выбіваюцца на разнастайныя ўчасткі гаспадарчай і культурнай работы.

Перад жанчынамі краіны Саветаў шырока адчынены дзверы школ, розных курсаў, тэхнікумаў, вышэйшых навучальных устаноў.

Усеагульнае абучэнне абавязкова для дзяўчынак, як і для хлопчыкаў. Рост колькасці дзяўчынак - вучаніц асабліва паказальны ў Закаўказзі, Сярэдняй Азіі, дзе пры царызме дзяўчынак зусім не вучылі і *жанчыны былі абсалютна непісьменныя.* А зараз сярод нашых жанчын—інжынеры, тэхнікі, урачы, аграномы, настаўнікі, навуковыя работнікі, музыканты, артысты, скульптары. Яны даюць цудоўныя ўзоры творчасці, дастойныя гераічнай нашай эпохі.

Жанчына-маці у нашай краіне акружана пастаяннымі клопатамі і ўвагай. Наша партыя і ўрад робяць усё для таго, каб забяспечыць шчаслівае, радаснае мацярынства. Больш 3-х мільярдаў рублёў выдала ўжо наша дзяржава многадзетным мацерам. З года ў год расце колькасць ясляў і лічыць дзіцячых садоў, піонерскіх лагераў, пляцовак і т. д.

Кожны савецкі грамадзянін—мужчына і жанчына—хоча быць гатовым да абароны сваёй цудоўнай радзімы і лічыць ваеннаю справу сваёй кроўнай справай. Новы закон аб усеагульным воінскім абавязку дае права жанчыне быць у радах Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Гэты закон быў спаткан патрыятычным уздымам мільённых жаночых мас.

...«Савецкая жанчына, у тым ліку і жанчына Чырвонай Арміі, нараду з мужчынай, — сказаў таварыш Варашылаў, — робіць усё, каб наша сацыялістычная Радзіма развівалася, мацнела і цвіла усімі колерамі нашых сацыялістычных перамог і дасягненняў. Яна стаіць за мір ва ўсім свеце, яна змагаецца за шчасце працоўнага чалавецтва.

Калі-ж класавыя ворагі задумаюць ажыццявіць свае разбойніцкія намеры і паспрабуюць напасць на Савецкі Саюз, яны сустрэнуць радам з нашай непераможнай Чырвонай Арміяй усёсакрушальную сілу ў асобе нашых жанчын, у асобе савецкіх мацерэй, жонак і сясцёр».

Жанчыны нашай краіны цвёрда памятаюць, што перамогі самі не прыходзяць, іх завяёўваюць. Народ наш адстаў заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў бязлітаснай барацьбе з ворагамі сацыялізма.

Наша доблесная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія пакрыла сябе неўвядаемай славай у грамадзянскай вайне, у барацьбе ля возера Хасан, у абароне граніц Мангольскай Народнай Рэспублікі, у вызваленні народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Зараз яна, ліквідуючы плацдарм вайны, умацоўваючы ваенную магутнасць СССР, абараняючы яго паўночна-заходнія рубяжы, калыбель рэвалюцыі — горад Леніна, разам з тым аказвае дапамогу Народнаму ўраду Фінляндыі ў вызваленні фінскага народа ад памешчыкаў і капіталістаў. У гэтай барацьбе гераічна ўдзельнічаюць і нашы жанчыны. Імёны многіх вядомы ўжо ўсяму Савецкаму Саюзу. Сярод іх—ваенфельчар В. І. Ціткова, узнагароджаная ордэнам Леніна, ваенурач 3-га ранга Р. З. Іофе, узнагароджаная ордэнам «Красная Звезда», ваенурач 1-га ранга Г. Л. Розенбаум, узнагароджаная ордэнам «Красная Звезда», і многія іншыя.

У сэрцах жанчын нашай краіны кіпіць свяшчэнная нянавісць да ворагаў сацыялізма, падпальшчыкаў і правакатараў вайны. Няхай ведаюць ворагі, што па першаму закліку партыі, урада, таварыша Сталіна мільёны жанчын паднімуцца арганізаваным строем, каб сцерці з твару зямлі ўсіх, хто асмеліцца пасягнуць на нашы рубяжы.

Савецкая жанчына з напружанай увагай сочыць за рэвалюцыйнай барацьбой працоўных жанчын капіталістычных краін. Жанчыны СССР вельмі добра ведаюць, што ў рашучых баях працоўныя масы жанчын у капіталістычных краінах зоймуць пачотнае месца. Гераічная барацьба жанчын у Іспаніі паказала нямала прыкладаў самаадданасці. Барацьба кітайскіх жанчын сведчыць аб іх гераізме і мужнасці.

З кожным днём усё мацней і магутней раздаецца заклік Камуністычнага Інтэрнацыянала «Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся»! Ён заклікае працоўных жанчын усяго свету да арганізацыі і згуртавання сваіх сіл пад сцягам Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна для барацьбы за камунізм, за шчаслівае і радаснае жыццё.

КЛАЎДЗІЯ НІКАЛАЕВА.

ТЭЛЕГРАМЫ

ВАЙНА Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

НА ЗАХОДНІМ ФРОНЦЕ

Парыж, 4 сакавіка. (ТАСС). У вячэрнім афіцыяльным паведамленні ад 3 сакавіка ўказвалася, што ў час вылазкі непрыяцеля на захад ад Вагезаў германцы захапілі некалькі палонных. У сваю чаргу наладжаная французамі ў сектары ракі Лаўтэр засада закончылася поспехам. 4 сакавіка раніцой паведамляецца, што ноч прайшла адносна спакойна на ўсім фронце.

Берлін, 4 сакавіка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро 3 сакавіка паведаміла: «На ўсход ад Мозеля быў адбіт непрыяцельскі ўдарны атрад. На паўднёвы ўсход ад Саарлаўтэрна германскі патруль узарваў французскае сховішча.

Да даных аб стратах англійскай і французскай авіяцыі за поўгода (285 самалётаў) неабходна дадаць тры французскіх самалёты, збітых у пагранічнай паласе.

Вынікі поўгадовай вайны ясна даказваюць боездолнасць германскіх войск, якія адкінулі праціўніка да выходных пазіцый.

Германскі флот прычыніў англійскаму флоту адчувальныя страты. Становішча англійскага ваеннага флота лепш за ўсё характарызуецца тым, што ён схаваўся ў раёне англійскага і шатландскага ўзбярэжа, будучы вымушаны адыйсці з Скапафлоу і скарацiць аперацыі ка паўночным моры.

Германская авіяцыя ва ўсіх паветраных баях атрымлівала верх. Англійскія знішчальнікі не маглі пашкодзіць разведкам і нападам германскіх самалётаў на канваіруемыя караваны суднаў у англійскіх тэрытарыяльных водах».

Берлін, 4 сакавіка. (ТАСС). Па паведамленню з Бруселя, 3 сакавіка над Бельгіяй праляцела некалькі самалётаў невядомай нацыянальнасці. Зенітныя батарэі адкрылі па іх агонь.

ДЗЕЯННІ АВІЯЦЫІ

Парыж, 4 сакавіка. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе, што 2 сакавіка нямецкі самалёт быў атакован над раёнам Эпіналь (Вагезы) дзума французскімі знішчальнікамі, загарэўся і зваліўся. Тры абвугленых трупы былі выцягнуты з-пад абломкаў. Чацверты чалавек з нямецкага экіпажа, які саскочыў з парашутам, узят у палон.

Берлін, 4 сакавіка. (ТАСС). Інфармацыйнае бюро абвяргае перадапае 3 сакавіка агенцтвам Гавас паведамленне аб баях паміж двума англійскімі знішчальнікамі і германскімі самалётамі, у час якога быў нібыта збіт адзін германскі самалёт, а два звернуты на ўцёкі.

Інфармацыйнае бюро заяўляе, што ў сапраўднасці бой адбыўся паміж 4 германскімі самалётамі і 12 французскімі знішчальнікамі, у час якога немцы збілі французскі самалёт. Другі паветраны бой адбыўся паміж германскім разведчым самалетам і двума англійскімі знішчальнікамі. У выніку таго, што абодва маторы германскага самалёта адмовілі, прышлося зрабіць вымушаную пасадку на французскай тэрыторыі. Германскія лётчыкі падпалілі самалёт і знішчылі яго. Два чалавекі з састава каманды, з якіх адзін быў цяжка ранены, прабіліся праз французскую передавую лінію ўмацаванняў да германскай граніцы.

Лондан, 4 сакавіка. (ТАСС). Як передае агенцтва Рэйтэр, учарашняе паведамленне аб тым, што англійскія знішчальнікі збілі германскі бамбардыроўшчык, не адпавядаюць сапраўднасці. На самай справе тры англійскіх знішчальнікі атакавалі англійскі-ж бамбардыроўшчык, прынятым імі за германскі. Яны абстралялі яго з кулямётаў, хаця ён, ахоплены полымем, упаў у мора.

ВАЙНА НА МОРЫ

Берлін, 4 сакавіка. (ТАСС). У Паўночным моры загінуў, наскочыўшы на міну, англійскі параход «Альбана», вадазмяшчэннем у 1.176 тон.

Лондан, 4 сакавіка. (ТАСС). Афіцыяльна аб'яўлена, што 2 сакавіка ў даліне Ламанш германскі бамбардыроўшчык падвергнуў бамбардыроўцы англійскі параход «Донала», быў забіт капітан і на судне ўспыхнуў пажар. 20 англійскіх падданых з 48 і 88 індусаў з 253 загінулі без вестак і, як мяркуюць, загінулі. Англійскія судны і галандскі параход выратавалі большасць пасажыраў і каманду парахода «Донала». Сярод выратаваных многія ранены. Параход дастаўлен ў порт.

Нью-Йорк, 4, сакавіка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Сан-Хуана, партовае амерыканскае судно берагавой абароны «Унальга» вярнулася пасля пошукаў англійскага грузавога парахода «Саўтгейт», які 1-га сакавіка паведаміў, што падвергнуўся нападу падводнай лодкі. 2-га сакавіка параход «Саўтгейт» паведаміў берагавой радыёстанцыі, што ён непашкоджан.

АГЕНЦТВА АСОШЫЭЙТЭД ПРЭС АБ ПРЫЁМЕ УЭЛЕСА ГІТЛЕРАМ

Нью-Йорк, 3 сакавіка (ТАСС).

Па паведамленню берлінскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, Уэлес гутарыў з Гітлерам на працягу паўтары гадзіны.

Як перадаюць,—піша карэспандэнт, — Гітлер паведаміў Уэлесу, што германа-совецкія па аднені зрабі і Германію ў вайне з Англіяй і Францыяй непараможнай эканамічна. Гітлер заявіў, што Германія прыняла на сябе ў Цэнтральнай Еўропе такія-ж абавязкі, якія ЗША прынялі ў адносінах да ўсіх амерыканскіх краін. Германія жадае зварота ей калоній. Гаворачы аб раззбраенні, Гітлер патрабаваў раззбраення такіх англійскіх крэпасцей, як Гібралтар, Мальта, Сінгапур, каб спыніць англійскі кантроль над марскімі шляхамі. Гітлер запытаў Уэлеса, якая-б была пазіцыя ЗША, калі б не амерыканская дзяржава кантраліравала Панамскі канал. Гітлер таксама патрабаваў пастаяннай гегемоніі Германіі над Багеміяй, Маравіяй, Славакіяй, Польшчай і Венгрыяй, а таксама гарантыі, што Англія і Францыя не штурхнуць супроць Германіі балканскія і скандынаўскія краіны. Пры гэтым Гітлер запытаў у Уэлеса, якая была б пазіцыя ЗША, калі б якая-небудзь азіяцкая ці еўрапейская дзяржава паспрабавала кранyць Мексіку.

—o—

АДКРЫЦЦЁ КІРМАШУ Ў ЛЕЙПЦЫГУ

Берлін, 3 сакавіка.

Як паведамляе агенцтва Трансацэан, сёння ў Лейпцыгу адкрыўся чарговы вясенні кірмаш. Усяго на кірмашы прадстаўлена 6400 германскіх і 200 замежных фірм, супроць 6411 германскіх і 271 замежных фірм у 1939 годзе. У гэтым павільёне знаходзяцца дакументы, якія датычацца польскай вайны, шматлікія карты, фотаздымкі і ваенныя матэрыялы, якія захоплены германскімі войскамі ў Польшчы. На адкрыцці кірмашу з прамовай выступіў міністр прапаганды Гебельс.

(ТАСС)

Будаўніцтва іспанскай „лініі Мажыно"

Газета «Іўнінг стандарт» паведамляе, што Іспанія будуе ў Ніжніх Пірэнеях стратэгічную дарогу і лінію ўмацаванняў.

Новая «лінія Мажыно», піша газета, праходзіць у непасрэднай блізасці ад французскай граніцы і французскіх баскскіх вёсак Эснань і Лес-Айдуд, размешчаных у даліне Бэгоры.

Сярод рабочых, заканчвае газета, занятых на будаўніцтве гэтых умацаванняў, знаходзіцца многа палонных рэспубліканцаў.

Балгарскі друк аб поспехах Чырвонай Арміі

Сафія, 4 сакавіка. (ТАСС). Балгарскі друк падрабязна апісвае дзеянні Чырвонай Арміі і падкрэслівае несакрушальную сілу яе наступлення. Журнал «Стопанскі праблемы» піша: «12 лютага аператыўная зводка Штаба Ленінградскай Ваеннай Акругі паведаміла аб рашаючым прарыве фінскіх умацаваных ліній на Карэльскім перашэйку і захопе раду ўмацаваных пунктаў. Пасля гэтага наступленне совецкіх войск прыняло нестрыманы характар. Фіны былі адкінуты на другую ўмацаваную паласу, а з 20 лютага совецкія войскі захапілі ўсю заходнюю і ўзбярэжную частку перашэйка і падышлі да галоўнага ўмацавання — пункта Выбарга». Далей журнал піша, што, не гледзячы на ўсе цяжкасці наступлення совецкіх войск, разгром манергеймаўскай Фінляндыі з'яўляецца пытаннем самага бліжэйшага будучага.

Газета «Зора», падрабязна аналізуючы становішча, якое склалася ў сувязі з падзеннем Выбарга, піша, што пераход Выбарга — гэтага асноўнага ўмацаванага пункта—у рукі Чырвонай Арміі, створыць новае стратэгічнае становішча на ўсім фронце. Газета падкрэслівае, што дзеянні совецкіх войск на Карэльскім перашэйку сведчаць аб умелай тактыцы совецкага камандавання.



«ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ»

Швандзя — народны артыст рэспублікі А. Ільінскі.
Нікалаў — артыст Іваноў.
Прафесар — заслужаны артыст рэспублікі У. Сяргейчык.

ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

ПЕРАДАВІКІ ДАЛЁКАГА ЎСХОДА

Хабараўск. Ад калгасаў, соўгасаў, машынна - трактарных станцый і перадавікоў края паступіла 2209 заяў аб жаданні ўдзельнічаць на Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1940 года. Заяў падана ў два разы больш, чым у мінулым годзе.

Зараз у абласцях края ідзе зацвярджэнне кандыдатаў. Пачотнае права паказаць свае дасягненні заваявалі 33 сельгасарцелі, два калгасы, дзве машынна - трактарныя станцыі, 13 калгасна - таварных ферм і 1128 калгаснікаў.

ПАСЁЛКІ ДЛЯ ВАНДРОЎНІКАЎ

Якуцк. У Якуцку праводзіцца вялікая работа па пераводу вандроўных гаспадарак на аседлы вобраз жыцця. На жыллёвае, гаспадарчае і культурна-бытавое будаўніцтва асігнавана 2.300 тысяч рублёў. У глухой тайзе вырастуць упарадкаваныя пасёлкі. У іх паселяцца сем'і вандроўнікаў.

ВЫДАТНЫЯ ПАДАРУНКІ

Перм. Выдатныя падарункі атрымаюць 8 сакавіка жанчыны г. Перм. На заводзе ім. Сталіна адкрыліся два дзіцячыя сады на 100 месц кожны. Яны размясціліся ва ўноў пабудаваных, добра абстаўляваных памяшканнях. Дзіцячыя яслі на 120 месц пачалі працаваць на заводзе ім. Молатава.

8 сакавіка адкрыецца радзільны дом на лесакамбінаце «Красный Октябрь».

ТЭАТР

„ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ"

Цяжка пераацаніць значэнне гэтага спектакля для беластоцкага гледача. Мы можам толькі дзякаваць Другі Дзяржаўны Беларускі драматычны тэатр за тое, што ён уключыў у свой рэпертуар гэту п'есу, бо «Любоў Яравая» К. Трэнёва больш, чым якая-небудзь іншая п'еса, дазваляе нам у думках перанесціся ў гарачыя дні першых год улады Советаў. Усе ўстоі старога свету рушыліся, хаваючы пад сваімі абломкамі чалавечую гніль. Пролетарская рэволюцыя, як віхор, змятае усіх, хто ёй супраціўляецца. Хіба польскія паны, якія прыгняталі народ і кінулі яго на волю лёсу пры першай - жа небяспецы, хіба гэтыя «героі» так ужо адрозніваюцца ад белагвардзейцаў, паказаных старым рускім пісьменнікам К. Трэнёвым у яго выдатнай п'есе «Любоў Яравая»?

Аналогія ўпаўне ўмесная і павучальная. Прыгняталынікі народа ў грозны рашучы час ператвараюцца або ў яшчэ больш жорсткіх катаў, яшчэ больш гнусных трусоў, або ў... гандляроў, спекуліруючых цукрам.., А сапраўдным абаронцам радзімы, сапраўдным патрыётам астаецца толькі рабочы і селянін.

Сіла мастацкага ўздзеяння «Любові Яравой» вялікая. На працягу многіх год не сходзіць яна з падмосткаў совецкай сцэны. Гэта п'еса не старэе. Больш таго: чым больш мы аддаляемся ад 1917 — 1919 гадоў, тым даражэй, тым ясней, важней становяцца для нашага сэрца малюнкі гэтай праўдзівай, сапраўды рэалістычнай п'есы. У ёй удала спалучаецца паказ страсцей грамадскіх і асабістых.

Як выконваецца п'еса тэатрам? Самаму строгаму крытыку амаль няма ў чым папракнуць артыстаў, якія ўдзельнічаюць у спектаклі. «Любоў Яравая» — удача тэатра, Выкананне ролей добрае, адчуваецца, што тэатр нямала папрацаваў над кожнай дэталлю. Гэта добрасумленнасць адчуваецца ў кожным абзацы п'есы.

Ролю Яравой выконвае артыстка Н. К. Глебоўская. Ствараемы ёю вобраз дакладна і чотка акрэслен.. Камісар Кошкін, якога іграе заслужаны артыст БССР Н. П. Звездачотаў, просты і суровы. Матрос Швандзя ў выкананні народнага артыста БССР А. К. Ільінскага — абаяльны і дарагі нам.

Выдатна выконваюць свае ролі і ўсе астатнія ўдзельнікі спектакля. Трэба толькі заўважыць, што Коласаў (артыст М. В. Фадзееў) мог-бы быць больш лірычны, а сялянка Марыя (арт. Т. Л. Бандарчык) — больш збянтэжаная, чым мы гэта бачым на сцэне.

Заўвагі, як бачыць чытач, не істотныя. Паўтараем, спектакль тэатру ўдаўся. Мы хочам толькі паспрачацца з пастаноўшчыкам п'есы, рэжысёрам В. Д. Дарвішавым: навошта у такім велічна простым і ясным спектаклі ўжываць «светавыя плямы»? Чаму рэжысёр пакідае ў поўзмроку значную частку сцэны? Чаму баіцца ён святла?

Па нашай думцы, гэты яркі спектакль не мае патрэбы ў падобных «эфектах».

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Аб правядзенні веснавой ачысткі ў гарадах: Беластоку, Гродна, Ломжы і раённых цэнтрах Беластоцкай вобласці

ПАСТАНОВА

Абласнога выканаўчага камітэта

29 лютага 1940 г. г. Беласток.

1. Аабавязаць усіх домаўласнікаў, кіраўнікоў дамоў, камендантаў інтэрнатаў, дырэктараў прадпрыемстваў, фабрык, заводаў, школ і інш. ачысціць прыбіральні, выграбныя і памыйныя ямы і вывезці ўсе нечыстоты і смецце ў адведзеныя для гэтага месцы не пазней 15 сакавіка 1940 г.

2. Абавязаць усіх кіраўнікоў дамоў, камендантаў інтэрнатаў, дырэктараў прадпрыемстваў, фабрык, заводаў, школ прыватных домаўласнікаў не пазней 15 сакавіка зрабіць рамонт і прывесці ў спраўнае становішча прыбіральні, выграбныя і смеццевыя яшчыкі, а таксама пабудаваць новыя, дзе такіх няма. Усе яшчыкі павінны быць забяспечаны крышкамі, прыбіральні і яшчыкі—знадворку пабелены.

3. Абавязаць усіх пералічаных у першым пункце гэтай абавязковай пастановы асоб прыступіць да штодзённай дэзінфекцыі (20 проц. растворам хлорнай вапны) усіх прыбіральняў, выграбных і памыйных ям і смеццевых яшчыкаў, праводзячы рэгулярную ачыстку такавых не радзей аднаго разу ў шасцідзёнку.

4. Абавязаць усіх указаных у першым пункце гэтай пастановы асоб да 15 красавіка г. г. ачысціць і адрамантаваць усе шахтныя (укапаныя) студні, забяспечыўшы іх крышкамі і прымацаванымі вёдрамі. Утрамбаваць глінай або замасціць акружаючую студню тэрыторыю.

5. Падвяргаць асоб, віноўных у нарушэнні гэтай пастановы, адміністрацыйнаму спагнанню — штрафу да 100 рублёў, або прымусовым работам да 14 дзён.

6. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскласці на органы РК Міліцыі і Дзяржсанінспекцыі.

7. Гэта абавязковая пастанова ўваходзіць ў сілу з дня яе апублікавання.

Старшыня аблвыканкома
МАЛЬЦАЎ

Сакратар аблвыканкома
ЕГОРАЎ

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 266. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.